

BLR

Адкрый для сябе! Даследуй! Знаёмся!

# РАМЕСНЫЯ ЎМЕННІ І ТРАДЫЦЫІ









Латвія I Літва I Беларусь

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ 2014-2020













**Адкрый для сябе, даследуй і знаёмся з рамеснымі ўменнямі і традыцыямі ў Латвіі, Літве і Беларусі!**

Маршрут дае магчымасць наведаць аб’екты рамеснага турызму Зэмгальскага рэгіёна, Нэрэцкага краю (LV), Вільнюскага і Рокішкіскага раёнаў (LT), а таксама Полацка і яго ваколіц (BLR), дзе падарожнікі змогуць прыняць удзел у рамеснай творчасці.




Усе ахвотныя змогуць паспрабаваць свае сілы ў традыцыйных латвійскіх і літоўскіх рамёствах: ткацтве, вырабе скур, ганчарстве, валенні, разьбе па дрэве, ліцці свечак, саломапляценні, выпяканні хлеба і вінаробстве, даведацца пра адмысловую літоўскую традыцыю пляцення вербаў, зрабіць уласную цацку. На некаторых аб’ектах падарожнікі змогуць таксама атрымаць асалоду ад кулінарнай спадчыны розных народаў, напрыклад, пакаштаваць традыцыйныя татарскія клёцкі. У сваю чаргу беларусы падзеляцца народнымі ўменнямі ў мастацкім выразанні з паперы (выцінанцы), вырабе дываноў, пляценні паясоў і стварэнні лялек-абярэгаў.
Падарожжа па гэтым маршруце дасць магчымасць не толькі атрымаць першасныя веды пра розныя латышскія, літоўскія і беларускія традыцыйныя рамёствы, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне, але і адчуць сябе майстрам і сваімі рукамі зрабіць на памяць невялікі, але ўнікальны сувенір.
**Адкрый для сябе месцы і людзей, якія шануюць, захоўваюць і перадаюць нашчадкам у спадчыну старажытныя рамёствы і традыцыі!**

**Змест**

Уводзіны ........................................................ 3

Горад Полацк і Полацкі раён, Беларусь ........................................................ 4

Вільнюскі раён, Літва .............................. 7
Рокішкіскі раён, Літва ............................ 10

Зэмгальскі рэгіён, Латвія..................... 12
Карта аб’ектаў агляду .......................... 16
Нэрэцкі край, Латвія.............................. 26




**Абазначэнні**

Для наведвання ўсіх аб’ектаў агляду патрабуецца папярэдняя заяўка!

Бліжэйшы да аб’ектаў турыстычны інфармацыйны цэнтр / пункт / пастаўшчык інфармацыі.




# ПОЛАЦК І ПОЛАЦКІ РАЁН

Запрашаем наведаць самы старажытны горад Беларусі! Ужо з 862 года Полацк, размешчаны на рацэ Заходняя Дзвіна, вядомы як буйны гандлёвы і рамесны цэнтр Усходняй Еўропы. Горад захаваў самабытныя рамесныя традыцыі, закладзеныя стагоддзі таму назад, і з задавальненнем прапануе сваім гасцям пазнаёміцца з імі, зрабіць сваімі рукамі пояс, ляльку-абярэг або дыван-маляванку падчас майстар-класаў.

1

## Інфармацыйны турыстычны цэнтр горада Полацка

Да нашага часу захаваліся многія віды народных рамёстваў. З некаторымі з іх можна пазнаёміцца на майстар-класах, напрыклад, з асноўнымі прынцыпамі вырабу тканага пояса на дошчачках. У традыцыйнай беларускай культуры пояс лічыцца моцным абярэгам ад няшчасцяў і злых духаў. Таму менавіта ён адыгрывае вялікую ролю ў




сямейна-бытавых і каляндарна-земляробчых абрадах беларусаў. Падчас майстар-класа можна самастойна сплесці сабе ці сваім блізкім пояс-абярэг, даведацца пра ўвасабленне нацыянальнага менталітэту ва ўзорах-сімвалах. У канцы XIX – пачатку XX ст. выцінанку, або ажурны ўзор, выразаны з белай, чорнай ці каляровай паперы, можна было ўбачыць у многіх беларускіх хатах. Сурвэткі і сняжынкі, рознакаляровыя разеткі і ўзоры на сцены, выразаныя фіранкі на вокны – усё гэта з лёгкасцю можна і сёння зрабіць сваімі рукамі.

Асаблівага майстэрства беларускія рамеснікі дасягнулі ў вытворчасці гіпсавага дэкору. Зараджэнне гэтага мастацтва адносіцца да эпохі ранняга Сярэднявечча і цесна звязана з аздабленнем архітэктурных культавых і свецкіх пабудоў. Найвышэйшага свайго росквіту гіпсавае ліццё ў Беларусі дасягнула на мяжы XVII і XVIII стст. Да гіпсу дадавалі спецыяльныя рэчывы, пасля чаго ён набываў асаблівую трываласць. Гіпсавыя адліўкі можна было лёгка афарбоўваць, імітуючы больш дарагія матэрыялы. Пра ўсё гэта і многае іншае можна пачуць ад майстра-рамесніка і, вядома, зрабіць сувенір, які будзе радаваць светлымі ўспамінамі аб старажытным горадзе Полацку.

пр. Ф. Скарыны, 8, г. Полацк,
Віцебская вобласць, Беларусь
55.485158, 28.766435

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949















2

### Полацкі раённы Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур

У Цэнтры рамёстваў Полацка захавалі традыцыі аднаго з самых старажытных відаў рамяства на беларускіх землях – ганчарства. Пад кіраўніцтвам майстра тут можна зрабіць невялікі керамічны посуд ці сувенірную прадукцыю ў выглядзе цацак і розных сімвалаў.










Таксама ў Цэнтры можна даведацца пра асаблівасці стварэння беларускіх маляваных дываноў, на якіх сустракаліся як сцэны са штодзённага жыцця, так і праявы фантастычнага, ірэальнага свету казак і легенд. Традыцыі гэтага народнага жывапісу развіваліся ў 1920-х–1960-х гадах на захадзе Віцебскай вобласці. Невялікі маляваны дыван можна зрабіць сваімі рукамі.
Наведвальнікі Цэнтра змогуць пазнаёміцца таксама і з лакальнымі традыцыямі стварэння лялек-берагінь – славянскага абярэга для аховы хаты. І кожны зможа зрабіць свой абярэг.

вул. Ніжне-Пакроўская, 27, г. Полацк,
Віцебская вобласць, Беларусь
55.484285, 28.768005
www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

www.polotsk-turizm.com

# ВІЛЬНЮСКІ РАЁН



ЛІТВА

Падарожжа па Вільнюскім раёне падорыць кожнаму новыя веды і ўражанні. Розныя нацыі на працягу многіх стагоддзяў жылі на гэтай зямлі, і да нашых дзён тут захаваліся іх традыцыі і рамёствы: ліццё свечак, выраб керамічнага посуду, пляценне з саломкі, валенне з воўны. Тут можна адчуць цудоўны водар і смак традыцыйных татарскіх пельменяў. У наведвальнікаў будзе магчымасць непасрэдна паўдзельнічаць у прыгатаванні традыцыйнага татарскага пірага, які складаецца з вялікай колькасці пластоў тонка раскачанага цеста. Па-літоўску пірог так і называецца «шымталапіс», а па-беларуску – «перакачаўнік». Менавіта на Віленшчыне бярэ пачатак традыцыя плесці на хрысціянскую Вербніцу рытуальныя вербы з сухіх кветак і траў. Іх плятуць у некалькіх вёсачках паблізу Вільнюса, а асаблівасці іх стварэння і цяпер перадаюцца жанчынамі з пакалення ў пакаленне. Запрашаем пазнаёміцца бліжэй з захаванымі народнымі рамёствамі!

3

### Вёска Сорак Татараў

Вёска Сорак Татараў – адно з найстарэйшых татарскіх паселішчаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Першыя жыхары з'явіліся тут яшчэ ў XIV ст. Традыцыйныя татарскія стравы – чабурэкі, шурпа, клёцкі, плоў, галубцы, пірог «перакачаўнік» – адыгралі значную ролю ў фарміраванні літоўскіх кулінарных традыцый. Дом татарскай абшчыны прапануе адукацыйныя праграмы, прысвечаныя кулінарнай спадчыне татараў, іх традыцыям і культуры. Мясцовыя жыхары шчодра дзеляцца сваімі кулінарнымі сакрэтамі, як прыгатаваць смачныя клёцкі, зрабіць халву ці зварыць варэнне, спячы святочны пірог «перакачаўнік» і пірог з гарбузом.

вул. Вітаўто, 9, вёска Сорак Татараў,
Вільнюскі раён, Літва
54.561440, 25.169833
www.fortytatarsvillage.lt
+370 67600250

4

### Гаспадарка, у якой вырабляюць натуральнае мыла

Сям'я літоўскіх рамеснікаў развівае невялікі сямейны бізнес – вырабляе мыла. З 2009 г. гэта мыла з'яўляецца сертыфікаваным прадуктам, які адносіцца да нацыянальнай спадчыны, паколькі вырабляецца па старажытных рэцэптах.




Для вырабу мыла рамеснікі выкарыстоўваюць толькі натуральную сыравіну, а для яго фарбавання – насенне раслін і пялёсткі кветак. У гаспадарцы расце багата карысных раслін: шыпшына, наготкі,

рамонак, мята, шалфей, лаванда. Усе гэтыя расліны служаць асновай для кветкавай вады, раслінных алейных экстрактаў і мыла. Эфірны алей у працэсе амылення не дасягае высокай тэмпературы, таму ўтрымлівае элементы, карысныя для скуры. Гэта цудоўная магчымасць самому зварыць мыла!

вёска Стайкішкес, 1, Вільнюскі раён, Літва
54.821981, 25.096542
www.muiloukis.lt
+370 68720501



3

5

## Цэнтр традыцыйных рамёстваў у сядзібе Гоўвальтаў

Адукацыйныя мерапрыемствы ў Цэнтры на месцы былой сядзібы Гоўвальтаў праводзяць народныя ўмельцы і рамеснікі, вырабы якіх маюць сертыфікаты нацыянальнай спадчыны Літвы. Вопытныя майстры (разьбяр па дрэве, цясляр і іншыя) ахвотна дзеляцца з гасцямі сваімі ведамі і ўменнямі. Наведвальнікам прапануюць пазнаёміцца з асаблівасцямі вырабу свечак, тканін і керамікі, саломапляцення і валення з воўны, а таксама навучыцца рабіць літоўскія святочныя вербы, традыцыі пляцення якіх захоўваюцца толькі на Віленшчыне.

вул. Альгірдо, 4, Майшагала,
Вільнюскі раён, Літва
54.867074, 25.062340
www.vrtic.lt
+370 67290225



5



3

www.vrtic.lt



8



5



5



7

# РОКІШКІСКІ РАЁН



ЛІТВА

Рокішкіскі край адметны не толькі багатай гісторыяй, спадчынай зямлі селаў, але і трапяткім стаўленнем да старадаўніх рамёстваў і традыцый. Мясцовыя рамеснікі – ткачы, разьбяры, валяльшчыкі воўны, пляцельшчыкі, пекары, вінаробы – ахвотна дзеляцца сваім досведам, а іх вырабы маюць сертыфікаты нацыянальнай спадчыны Літвы. Рамеснікі Рокішкіскага краю сваімі выключнымі працамі і вынаходлівасцю ўражваюць не толькі землякоў, але і гасцей.

6

## Цэнтр рамёстваў у Дусятасе

Майстар Эрыкас Чыпас займаецца разьбой па дрэве ўжо больш за 30 гадоў і з'яўляецца захавальнікам старых рамёстваў – вырабу лялек і бондарства. Яго рамесныя вырабы адносяць да літоўскай нацыянальнай спадчыны. У заснаваным з яго дапамогай


6

Цэнтры рамёстваў Э. Чыпас стварае ўнікальныя разныя вырабы і распрацоўвае адукацыйныя праграмы для жадаючых навучыцца гэтаму рамяству. Гасцей запрашаюць наведаць музей, які працуе ў цэнтры рамёстваў, і прыняць удзел у адукацыйным мерапрыемстве «Таямніцы дрэў», падчас якога можна навучыцца выразаць птушку, міску або апалонік, упрыгожваць свае вырабы старадаўняй літоўскай сімволікай, старажытнымі знакамі: вужанятамі, сонейкамі і дрэвамі жыцця. Таксама тут можна набыць арыгінальныя вырабы самога майстра.

вул. К. Бугас, 1, Дусятас,
Зарасайскі раён, Літва
55.74733, 25.840215
www.visitzarasai.lt
+370 61026296

7

## Рамесніцкія майстэрні фальварка Салас

У рамесніцкіх майстэрнях, якія знаходзяцца ў палацы фальварка Салас, праходзяць заняткі па пляценні з лазы, упрыгожванні драўляных цацак, выразанні лыжак, лепцы і ганчарнай справе. Наведвальнікаў запрашаюць творча правесці вольны час: пазнаёміцца са старадаўнімі рамёствамі, набыць асабісты вопыт і прынесці дамоў уласнаручны выраб, а самае галоўнае – спазнаць радасць творчасці. Госці таксама могуць прагуляцца па старым парку фальварка Салас, які размясціўся на востраве пасярод возера Двірагіс.

вул. Каштону,13, вёска Салас,
староства Камаяй, Рокішкіскі раён, Літва
55.811849, 25.367927
www.rokiskiotic.lt
+370 61000610



8

## Рокішкіская галерэя народнага мастацтва

Галерэя знаходзіцца ў самым цэнтры горада Рокішкіс, у гістарычнай яго частцы, прызнанай аб'ектам урбаністычнай спадчыны. Тут абсталяваны прасторная выставачная зала і памяшканні для заняткаў, дзе народныя ўмельцы Рокішкіскага краю праводзяць адукацыйныя мерапрыемствы для папулярызацыі рамёстваў і захавання пераемнасці этнічных традыцый. Распрацаваныя праграмы («Ткацтва», «Валенне з воўны», «Таямніцы дрэва» і інш.) спадабаюцца наведвальнікам рознага ўзросту. Тут можна навучыцца рабіць валеныя з воўны цацкі або шапкі, сплесці закладкі для кніг, выразаць лыжку і іншы драўляны посуд. Таксама ў галерэі можна набыць вырабы мясцовых народных майстроў.

пл. Непрыклаўсамібес, 8, Рокішкіс, Літва
55.964674, 25.587066
www.rokiskiotautodaile.lt
+370 68951279


7


7

www.rokiskiotic.lt


8

# ЗЭМГАЛЬСКІ РЭГІЁН



ЛАТВІЯ

Рэгіён Зэмгалэ багаты на старажытныя промыслы і рамёствы. На гэтай урадлівай зямлі жывуць руплівыя гаспадары і земляробы, якія самі валодаюць непераўзыдзенымі навыкамі такіх рамесных заняткаў, як ткацтва, выраб скур, ганчарства і хлебапячэнне, і заахвочваюць іншых да вывучэння старых рамесных традыцый і іх пераймання. Завітаючы на аб'екты гэтага маршруту, госці маюць выдатную магчымасць не толькі атрымаць уяўленне пра разнастайныя латышскія традыцыйныя рамёствы, закладзеныя мінулымі пакаленнямі, але і адчуць сябе майстрам і сваімі рукамі зрабіць на памяць унікальны сувенір з Зэмгалэ.

9

### Гісторыя Чорнага гаршка

Аматараў керамічнага мастацтва запрашаюць пазнаёміцца з гісторыяй Чорнага гаршка ў гасцявым доме «Baltā māja», дзе можна не толькі назіраць за працэсам, але і ўдзельнічаць у вырабе прадметаў з керамікі.
Пасля высыхання зроблены посуд шліфуецца шклом, металам або спецыяльным каменем; затым вырабы ставяць у печ для абпалу, тэмпература ў якой вышэй за 1000 градусаў, каб адбылося цудоўнае ператварэнне чырвонай гліны ў чорную.
Наведвальнікі таксама могуць паспрабаваць зрабіць посуд у тэхніцы кальцавога налепу, без выкарыстання прывычнага ганчарнага круга: перш з камяка гліны ўтвараецца дно і пачатак сценак, а далей, нібы паверх за паверхам, дадаюцца новыя слаі гліны.
Госці маюць магчымасць убачыць ганчарную майстэрню і печ для абпалу, наведаць выставы і набыць керамічныя вырабы.







«Baltā māja», Пілсрундалэ, Рундальская воласць, Рундальскі край, Латвія
56.416103, 24.030190
www.visit.bauska.lv
+371 29685191

10

### Ганчарная майстэрня «Laima Ceramics»

Майстар па кераміцы Лайма Грыгане стварыла ў доме свайго дзяцінства адкрытую ганчарную майстэрню. Тут мастачка вырабляе латвійскі гліняны посуд, які абпальваецца ў традыцыйнай дрывяной печы, а таксама фарфоравы посуд і посуд з каменнай масы. Мастачка прапануе наведвальнікам экскурсіі і творчыя майстар-класы па вырабе і ўпрыгожванні посуду ўзорамі і драўлянымі пячаткамі на свой




www.visit.bauska.lv

выбар (з латышскай і індыйскай сімволікай). Таксама яна праводзіць майстар-класы па тачэнні, адліўцы гіпсавых бранзалетаў, вырабе завушніц, посуду метадам лепкі з пласта, заняткі па тэхніцы сграфіта – упрыгожванні фарфоравага посуду ангобам, на які з дапамогай іголкі можна нанесці дэталёвую размалёўку перад абпалам. Акрамя таго, прапануюцца індывідуальныя майстар-класы, падчас якіх наведвальнік можа ўвасобіць у жыццё сваю арыгінальную ідэю.

«Urštēni», Світэнская воласць,
Рундальскі край, Латвія
56.405860, 23.959154

www.laimaceramics.com
+371 28338711







11

## Пякарня «Tērvetes maize»

Яніс Курпніекс – пекар з дваццацігадовым вопытам працы, мае дыплом падмайстра Латвійскай рамеснай палаты. У сваёй невялікай пякарні гаспадар спрабуе спалучаць старажытныя традыцыі выпякання хлеба з сучаснымі тэхналогіямі. Пякарня прапануе больш за 12 відаў хлеба, прыгатаваных па ўласных рэцэптах. У пякарні ладзяцца экскурсіі, падчас якіх можна пасмакаваць і набыць свежы хлеб, даведацца пра сакрэты выпякання хлеба, а таксама пашырыць свае веды пра латышскія народныя традыцыі, звязаныя з хлебам.

«Straumes», Тэрвэцкая воласць,
Тэрвэцкі край, Латвія
56.447987, 23.389050

www.facebook.com/tervetesmaize
+ 371 29967553

12

## Студыя народнага прыкладнога мастацтва «Bēne»

Студыя захоўвае латышскую культуру ткацтва і запрашае навучыцца яму ўсіх ахвотных. У студыі вырабляюцца спадніцы ў нацыянальным стылі, тканыя хусткі, паясы, шалікі, а таксама іншыя прыгожыя прадметы адзення. Госці могуць не толькі разгледзець і набыць гатовыя рэчы, але і прыняць удзел у майстар-класах прафесійных ткачоў. Умельцы адраджаюць ткацкае рамяство продкаў латышоў, бо працуюць на сапраўдных кроснах. Падчас візіту ў студыю можна даведацца шмат цікавага пра народны строй, характэрны для Зэмгальскага краю, пра асаблівасці яго вырабу і нашэння, пра старажытныя ўзоры на тканіне, іх значэнне і выкарыстанне ў нашы дні.

вул. Стацыяс, 8, Бэнская воласць,
Аўцкі край, Латвія
56.482059, 23.067792

www.auce.lv
+371 26201427

13

## Аўцкі Дом рамёстваў

У Доме рамёстваў працуе студыя, дзе шыюць народныя строі, ткуць хусткі ў нацыянальным стылі, ільняныя ручнікі, абрусы, ваўняныя коўдры і разнастайныя палавікі. Тут можна паглядзець і набыць гатовую прадукцыю. Студыя захоўвае і






www.tervetesnovads.lv
www.auce.lv

ўдасканальвае тэхніку гэтага старажытнага рамяства, умацоўваючы пачуццё прыналежнасці да латышскай духоўнай спадчыны, якое праз ткацтва перадавалася з пакалення ў пакаленне. Добразычлівыя майстрыхі падчас працы з задавальненнем дзеляцца назапашанымі ведамі, дазваляюць назіраць і ўдзельнічаць у працэсе.

вул. Райня, 14, Аўцэ, Аўцкі край, Латвія
56.463126, 22.894552

www.auce.lv
+371 28396984

14

## SIA «Krīgeri»

Гаспадарамі «Bemberi» ў Ільскай воласці з'яўляецца сям'я Грысліцісаў, якая ашчадна захоўвае латышскія нацыянальныя традыцыі. Гаспадыня Марыка – зацікаўленая і дасведчаная ткачыха – з задавальненнем дзеліцца сваім вопытам і вучыць усіх, хто жадае авалодаць такім характэрным і блізкім латышскаму народу рамяством. Наведвальнікаў гаспадаркі частуюць супам, прыгатаваным на вогнішчы, дамашнім хлебам, салодкімі прысмакамі. Тут распавядуць цікавую гісторыю пра тое, як спячы смачны хлеб на натуральных дражджах, зусім як у старажытныя часы. А на Каляды дзеці і дарослыя прымаюць удзел у выпяканні і ўпрыгожванні пернікаў.

«Bemberi 1», Ільская воласць,
Аўцкі край, Латвія
56.562107, 22.967391

www.auce.lv
+371 26201427





Латвія
Літва
Беларусь
RĪGA
VILNIUS
Talsi
Saulkrasti
Cēsis
Sigulda
Sabile
Tukums
Jūrmala
Olaine
Salaspils
Ogre
Madona
Biksti
Dobele
Jelgava
Ozolnieki
Iecava
Vecumnieki
Valle
Stalģene
Tērvete
Auce
Pilsrundāle
Eleja
Bauska
Žagarė
Skaistkalne
Skrīveri
Aizkraule
Koknese
Vecbebri
Pļaviņas
Jēkabpils
Sala
Atašiene
Viļāni
Rēzekne
Ludza
Vīpe
Līvāni
Ērberģe
Viesīte
Zasa
Preiļi
Nereta
Aknīste
Tadenava
Kaldabruņa
Daugavpils
Krāslava
Akmenė
Joniškis
Žeimelis
Lauksodis
Papilė
Biržai
Pasvalys
Juodupė
Rokiškis
Obeliai
Kamajai
Kriaunos
Dusetos
Šiauliai
Gaulėnai
Pakruojis
Radviliškis
Kupiškis
Panevėžys
Šiaulėnai
Kelmė
Kražiai
Upytė
Užpaliai
Anykščiai
Visaginas
Utena
Tauragnai
Ignalina
Raseiniai
Kėdainiai
Ukmergė
Molėtai
Švenčionys
Jurbarkas
Meškonys
Girija
Kaunas
Maišiagala
Pričiūnai
Nemenčinė
Kazlų Rūda
Vilkaviškis
Prienai
Birštonas
Trakai
Paliepiukai
Bareikiškės
Nemėžis
Juodšiliai
Medininkai
Marijampolė
Kalvarija
Alytus
Šalčininkai
Верхнядзвінск
Кляецiцы
Краснаполле
Браслаў
Опса
Міёры
Дзісна
Наваполацк
Палата
Полацк
Мішнявічы
Гарадок
Шаркаўшчына
Казьяны
Празарокі
Бікульнічы
Обаль
Ула
Ушачы
Глыбокае
Пастaвы
Лынтупы
Бешанковічы
Бароўка
Лепель
Нарач
Мядзел
Альхоўка
Докшыцы
Сянно
Бягомль
Новалукомль
Смаргонь
Вілейка
Ашмяны
A1
A2
A4
A5
A6
A7
A8
A9
A10
A11
A12
A13
A14
A16
E22
E67
E77
E85
E262
E272
P3
P14
P20
P27
P45
P46
M1
M3
M8
1
2
3
4
5
6
7
8
9
10
11
12
13
14
15
16
17
18
19
20
21
22
23
24
Riga
Латвія
Літва
Vilnius
Беларусь
Мінск
Земгальскі рэгіён
Нэрэцкі край / Горад Екабпілс
Рокішкіскі раён / Вільнюскі раён
Горад Полацк і Полацкі раён
















www.dobele.lv
www.visit.jelgava.lv

15

## Добэльскі Дом рамёстваў

У Доме створаны прыдатныя ўмовы для вывучэння старажытных і сучасных рамёстваў: тут можна паглядзець, павучыцца, набыць уменні і перадаць далей атрыманыя веды пра латышскія традыцыйныя рамёствы. Тут у розных творчых майстэрнях навучаць ткаць, вязаць на спіцах і кручком, плесці, валіць з воўны, рабіць упрыгажэнні, вышываць, прасці і сукаць пражу, рабіць прадметы з гліны і спасцігаць мудрасць латышскай народнай кухні.
Таксама наведвальнікі могуць паўдзельнічаць у экскурсіях, творчых майстар-класах, наведаць выставы і атрымаць кансультацыі па вырабе і нашэнні народных строяў Зэмгальскага краю.

вул. Базніцас, 8, Добэлэ,
Добэльскі край, Латвія
56.623355, 23.283425

www.kulturadobele.lv
+ 371 22049477

16

## Свэцкая керамічная майстэрня

У майстэрні, якая знаходзіцца на тэрыторыі былой сядзібы Свэтэ, наведвальнікі могуць паназіраць за працай ганчара, а таксама навучыцца яго справе на ганчарным крузе і зрабіць свой уласны керамічны выраб – кубак, скарбонку або медаль. Для розных калектыўных экскурсій, сямейных і сяброўскіх мерапрыемстваў падрыхтаваны тэматычныя праграмы. Так, напрыклад, маладажоны могуць разам зрабіць для сябе гліняны посуд. У майстэрні можна набыць гатовыя керамічныя вырабы, а таксама пакінуць індывідуальны заказ.

вул. Ліелсвэтэс, 18/8, Свэцкая воласць,
Елгаўскі край, Латвія
56.591561, 23.664722

www.visit.jelgava.lv
+371 26003899

17

## Цэнтр рамёстваў «Jaunlīdumi»

У Цэнтры працуюць вопытныя майстры па вырабе скур, якія даюць наведвальнікам магчымасць пазнаёміцца з працэсам апрацоўкі скур і стварэння скураных вырабаў, а таксама паўдзельнічаць у практычных занятках. Тут працуюць пераважна з галантарэйнай скурай. Яна мяккая і пластычная, падыходзіць для вырабу розных альбомаў, вокладак для нататнікаў, упрыгажэнняў і аксесуараў.




Для вырабаў са скуры ў якасці дэкаратыўных элементаў выкарыстоўваюцца латышскія знакі сілы і прыродныя матывы.
Наведвальнікі могуць самастойна зрабіць сабе скураны бранзалет, а таксама набыць ужо гатовыя аўтарскія рэчы.

вул. Іеву, 12, Дзірніекі, Яўнсвірлаўкская воласць, Елгаўскі край, Латвія
56.564978, 23.875249

www.visit.jelgava.lv
+371 26383129

18

## Студыя прыкладнога мастацтва «Staļģene»

Да XIX ст. земгалкі рабілі даматканыя тканіны для народных строяў з мясцовых матэрыялаў – воўны і лёну, якія афарбоўваліся раслiннымі фарбавальнікамі. У Зэмгалэ самай прыгожай лічыцца тканіна для спадніц з «ружачкамі» і коўдра з

18



20



18



20



20



«зорачкамі», якой хлопцы накрываліся, калі ноччу пасвілі коней, бо лічылі, што «зоркі» абараняюць ад зла. Да сярэдзіны XIX ст. майстрыхі ткалі для практычных патрэб, але ў XX ст. сталі больш часу аддаваць дэкаратыўным вырабам. У студыі ткуць традыцыйныя коўдры, ручнікі, хусткі, дарожкі і спадніцы. Ткачыхі ўдзельнічаюць у мясцовых і рэспубліканскіх выставах. Наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з гэтым традыцыйным рамяством праз назіранне і прыняць ўдзел у працэсе ткацтва пад кіраўніцтвам прафесійных ткачых. Акрамя таго, тут можна набыць гатовыя вырабы.

вул. Ліелупэс, 5, Стальгенэ, Яўнсвірлаўкская воласць, Елгаўскі край, Латвія
56.571180, 23.957523
www.visit.jelgava.lv
+371 28674293


18

19

## Майстэрня скураных аксесуараў «Dunense»

Гучная назва майстэрні скураных аксесуараў «Dunense» гістарычна пераклікаецца з назвай Даўгавы і Ганзэйскага шляху. «Dunense» працягвае старажытныя традыцыі вырабу скур, перадаючы назапашаныя веды і ўменні нашчадкам. У майстэрні наведвальнік адразу трапляе ў творчую атмасферу: разам з майстрамі можа актыўна ўдзельнічаць у стварэнні таго ці іншага вырабу са скуры, навучыцца адрозніваць розныя віды шкуры, адчуць сябе майстрам, зрабіць унікальны сувенір – бірульку для ключоў або бранзалет ва ўласным стылі. Таксама тут можна паглядзець на гатовыя рэчы і набыць тое, што спадабалася.

вул. 1905 года, 7, Кокнэсэ, Кокнэскі край, Латвія
56.644623, 25.432297
www.dunense.com
+371 29227936

20

## Ганчарная майстэрня «Zaļbirzes»

Майстар па кераміцы Інета Дзіркале ў сваёй майстэрні «Zaļbirzes» – радавым маёнтку некалькіх пакаленняў каля замчышча Аташыенэ – ставарае практычныя і дэкаратыўныя вырабы з гліны, якімі здаўна карысталіся ў сельскіх гаспадарках і карыстаюцца да гэтага часу. Наведвальнікі могуць паглядзець работы, падрыхтаваныя для выстаў, набыць кубкі, міскі, талеркі, посуд для мёду, падсвечнікі, свістулькі, падвескі «перазвоны ветру» і розныя сувеніры. Усе зацікаўленыя маюць магчымасць паназіраць і паспрабаваць зрабіць посуд на ганчарным крузе або з выкарыстаннем іншых тэхнік ганчарнага майстэрства.

«Zaļbirzes», Аташыенская воласць, Крустпілскі край, Латвія
56.511536, 26.419704
www.krustpils.lv
+371 26559420

21

## Віпскі Цэнтр рамёстваў «Māzers»

«Māzers» – месца, дзе традыцыі жывуць побач з сучаснасцю. Падарожнікам прапануецца не толькі наведаць выставы і майстар-класы, але і даецца магчымасць самім стварыць невялікі прадмет глінянага мастацтва. Падчас майстар-класаў па размалёўцы керамікі і ткацтве кожны госць зможа адчуць сябе крустпілскім майстрам: паспрабаваць саткаць дыван і распісаць гліняны кубак, што паслужыць сведчаннем


21

www.visitkoknese.lv
www.krustpils.lv


21


20


19


22




www.jekabpilsnovads.lv
www.muzejsselija.lv

творчых здольнасцей. У цэнтры працуе выстава народных строяў Крустпілскага краю і выстава-продаж рамесных вырабаў.

- «Vālodzīte», Віпэ, Віпская валасць, Крустпілскі край, Латвія 56.467090, 26.092938
- www.facebook.com/maazers
+371 26611297

22

### Цэнтр рамёстваў «Rūme»

Старадаўнасць сустракаецца з сучаснасцю ў «Rūme», дзе вывучаюць і захоўваюць старажытныя рамёствы Селіі. Тут можна пачуць на селійскім дыялекце гісторыі пра рамесніцтва ў цяперашнія і мінулыя часы, убачыць сучасныя керамічныя вырабы, набыць іх. Кожны наведвальнік можа не толькі паназіраць за працай майстроў і мастакоў Цэнтра, але і пазаймацца сам, набыць новыя ўменні і карысна правесці час, бо «Rūme» прапануе творчыя майстар-




класы па кераміцы, батыку і прыкладным вырабе скур. У Цэнтры прадстаўлены рэканструяваны археалагічны касцюм і аздабленні племя селаў (XI-XIII стст.).

- «Rūme», Заса, Заская валасць, Крустпілскі край, Латвія 56.294570, 25.981419
- www.facebook.com/amatniecibas.centrs.rume
+371 22335439

23

### Віесіцкі Цэнтр рамёстваў

Майстрыхі Цэнтра адраджаюць традыцыйнае рамяство і захоўваюць у сваіх работах старажытныя ўзоры і колеры, характэрныя для Селіі. Тут можна заняцца ткацтвам, вязаннем на спіцах і кручком. Кожны можа авалодаць асновамі гэтых тэхнік, дапоўніць свае веды ў працэсе работы або проста паназіраць за працэсам. Стварыць шапку з кляновага лісця, вышыць сваю манаграму, саткаць што-небудзь на кроснах – усё гэта дазваляе пазнаёміць гасцей з каштоўнасцямі этнаграфічнай спадчыны латышскага народа. Таксама тут можна набыць гатовую прадукцыю і наведаць пастаянную экспазіцыю.

- вул. Анны Бродэлэ, 7, Віесітэ, Віесіцкі край, Латвія 56.342242, 25.555184
- www.muzejsselija.lv
+ 371 28681126



# НЭРЭЦКІ КРАЙ

ЛАТВІЯ

Дасведчаны майстар керамікі з Нэрэты дасць магчымасць гасцям дакрануцца да таінства старажытнага ганчарнага рамяства, паглыбіцца ў творчы працэс, пашырыць далягляд і адчуць радасць тварэння. Для тых, хто хоча адкрыць у сабе творчую жылку, цяпер самы час адправіцца ў Нэрэту і пад кіраўніцтвам умелага віртуоза ганчарнага мастацтва ўласнаручна зрабіць гліняныя сувеніры.

24

### Ганчар Занда Рагеле

Занда Рагеле займаецца керамікай – адным з найстаражытнейшых рамёстваў – ужо 18 гадоў. Яе ганчарная майстэрня знаходзіцца ў маляўнічым месцы, на беразе ракі Двіенвідсусэя. Гліняныя вырабы яна стварае не на ганчарным крузе, а рукамі, надаючы




www.neretasnovads.lv

ім старажытны выгляд і выкарыстоўваючы чатыры ўнікальныя, уласцівыя толькі ёй тэхнікі: «латкі», адбіткі раслін, гліняныя «каўбаскі» і адліўку ў гіпсавых формах. У майстэрні можна зрабіць і набыць такія прыемныя воку прадметы хатняга ўжытку ў старадаўнім стылі, як вазоны, міскі, падсвечнікі і вазы. Керамічныя вырабы галоўным чынам пакрываюцца глазурай у натуральных, прыродных тонах: салатным, блакітным, цёмна-карычневым, белым, шэрым і жоўтым, што надае ім яшчэ больш старажытны выгляд.
Занда праводзіць майстар-класы, далучаючы гасцей да ганчарнага рамяства: яны вучацца працаваць з глінай і ўласнаручна ствараюць керамічныя вырабы. Потым, на працягу двух тыдняў, прадметы абпальваюць у печы, пасля чаго імі можна карыстацца.

«Kalna Gribacāni», Нэрэта, Нэрэцкая воласць, Нэрэцкі край, Латвія
56.200769, 25.322828

www.neretasnovads.lv
+371 28685585




Гэта брашура падрыхтавана для праекта ENI-LLB-1-108 «Павышэнне канкурэнтаздольнасці і ўстойлівасці турызму ў сферы культуры, садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і гістарычнай спадчыны ў Латвіі, Літве і Беларусі» Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. (Rediscover the roots of regions), якая накіравана на садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і мясцовай гістарычнай спадчыны шляхам павышэння ўстойлівай канкурэнтаздольнасці культурнага турызму ў Латвіі, Літве і Беларусі.

Агульны бюджэт праекта – 1 031 590,97 еўра (2 425 786,17 беларускіх рублёў). Уклад Еўрапейскага Саюза (90%) – 928 431,87 еўра (2 183 207,54 беларускіх рублёў).
Праграма трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. спрыяе сінергетычнаму партнёрству латвійскіх, літоўскіх і беларускіх арганізацый пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Стратэгічная мэта Праграмы – умацаванне адносін, павышэнне патэнцыялу і абмен вопытам паміж людзьмі і арганізацыямі шляхам рэалізацыі сумесных дзеянняў, накіраваных на павышэнне агульнай якасці жыцця ў прыгранічных рэгіёнах. Фінансаванне ЕС для Праграмы складае 74 мільёны еўра.

Дзяржавы-члены Еўрапейскага Саюза вырашылі паступова злучыць свае ноу-хау, рэсурсы і лёсы. Сумесна яны стварылі зону стабільнасці, дэмакратыі і ўстойлівага развіцця, захоўваючы пры гэтым культурную разнастайнасць, памяркоўнасць і павагу да асабістай свабоды. Еўрапейскі Саюз бярэ на сябе абавязацельства дзяліцца сваімі дасягненнямі і каштоўнасцямі з краінамі і народамі, якія знаходзяцца за яго межамі.

Гэта брашура фінансуецца Еўрапейскім Саюзам. Гэта брашура была падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Яе змест з'яўляецца выключнай адказнасцю Зэмгальскага планіровачнага рэгіёна і не з'яўляецца адлюстраваннем афіцыйнай пазіцыі Еўрапейскага Саюза.

Мы дзякуем партнёрам па праекце за супрацоўніцтва: аддзелу спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэту Нэрэцкага краю, муніцыпалітэту горада Екабпілса, Рэгіянальнаму музею горада Рокішкіса, муніцыпалітэту Вільнюскага раёна, уладальнікам аб'ектаў і пастаўшчыкам турыстычнай інфармацыі Зэмгальскага рэгіёна і Полацкага раёна, якія ўдзельнічалі ў стварэнні выдання.

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ 2014-2020

**Выдавец:** Зэмгальскі планіровачны рэгіён, www.zemgale.lv, 2021
**Дызайн, макет:** Ёланта Дэге
У брашуры выкарыстаны фотаздымкі латвійскіх, літоўскіх і беларускіх турыстычных інфармацыйных арганізацый, уладальнікаў аб'ектаў, музеяў, Зэмгальскага планіровачнага рэгіёна, аддзела спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэта Нэрэцкага краю, муніцыпалітэта горада Екабпілса і архіва Рокішкіскага краязнаўчага музея.
Аўтары – Оскар Калнынньш, Марыян Дзвінэл, Элза Элмане.

Глядзі і
шукай іншыя
турыстычныя
маршруты









Латвія I Літва I Беларусь